

# ДА 85-ГОДДЗЯ
# БРАНІСЛАВА ІОСІФАВІЧА ЕРМАШКЕВІЧА

Дарагі Браніслаў Іосіфавіч!

Хтосьці з мудрых сказаў: «Каб даведацца мой узрост, мяне трэба распілаваць і пералічыць пласты». Вобразна кажучы, чалавек, як дрэва, складаецца з пластоў. Але справа не ў іх колькасці. Дзяцінства, абпаленае вайной. Поўнае нягод і выпрабаванняў юнацтва. Вайсковая служба ў складаных умовах, потым – настаўніцтва, літаратурная творчасць і грамадскае жыццё… Гэтыя пласты загартавалі Вас, сфармавалі Ваш магутны ўнутраны стрыжань, які дапамагае рухацца па жыцці і не згінацца пад цяжарам гадоў. На прыкладзе Вашай шчырай любові да Беларусі, пачуццяў справядлівасці і чалавечай годнасці можна выхоўваць сапраўдных патрыётаў, абаронцаў Радзімы. Без Вашага ўдзелу немагчыма ўявіць літаратурнае жыццё Прынёмання, як і без каштоўнай парады, вясёлага жарту, па-бацькоўску добрага погляду немагчыма ўявіць Ваш вобраз. Дарагі сябра, сардэчна віншуем Вас з 85-годдзем; жадаем моцнага здароўя, невычэрпнай жыццёвай энергіі і сілы. Няхай і далей Ваш шлях да гармоніі, прыгажосці прыносіць плён грамадству і айчыннай культуры. Няхай цяплыня і святло, якімі Вы адорваеце тых, хто побач, ніколі не абмінаюць і Вас. **З ЮБІЛЕЕМ!**

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

***16 жніўня 2022 года***

